новятся элементом гардероба «просветлённых людей», которые видят больше обычного человека. Немаловажную роль здесь играет материал / цвет оправы очков.

Представлена **культурно-историческая функция**: синие очки носят исключительно нигилисты; также художественная деталь очки часто становится атрибутом портрета немцев.

В повести «Село Степанчиково…» и рассказе «Крокодил» данная деталь непосредственно задействована в идейном конфликте и таким образом выполняет **сюжетно-композиционную функцию**.

В ранних текстах исследуемая деталь обладает большей функциональной нагрузкой, в частности, особого внимания достоин незаконченный роман *«Неточка Незванова»* (1849) и его герой Пётр Александрович; однако на протяжении всего творческого пути писателя очки сохраняют за собой определённую значимость, редко выступая в качестве подробности.

**Литература**


1 Касаткина, Т. А. О творящей природе слова: Онтологичность слова в творчестве Ф. М. Достоевского как основа «реализма в высшем смысле» / Т. А. Касаткина. – М.: ИМЛИ РАН, 2004. – 480 с.



***В. А. Зянько***
*Навук. кір.* ***В. А. Ляшчынская,***
*д-р філал. навук, прафесар*


## НАЙМЕННІ ПРАДМЕТАЎ БЫТУ ЯК КАМПАНЕНТЫ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Фразеалагічныя адзінкі (ФА) утвараюцца з лексічных адзінак паводле правілаў і законаў мовы, ці на аснове свабодных слоў у складзе словазлучэнняў, словаспалучэнняў і сказаў у выніку іх метафарызацыі як самага пашыранага спосабу ўтварэння гэтых другасных адзінак. Вобразы ФА, іх кампанентны склад захоўваюць і перадаюць ад пакалення да пакалення выпрацаваныя правілы і нормы паводзін, светаўспрыманне, светаўяўленне народа-стваральніка гэтых адзінак, яны з'яўляюцца не толькі адзінкамі мовы, але і адзінкамі «мовы» культуры. Вось чаму вывучэнне ФА прадстаўляе вялікую цікавасць, у тым ліку і асобнай групы ФА беларускай мовы, што складаюць ФА з кампанентамі-найменнямі прадметаў быту як выніку створаных з імі вобразаў і адбору гэтых кампанентаў, што могуць многае расказаць пры іх «прачытанні».

Метадам суцэльнай выбаркі толькі з запаснікаў фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы [1] мы ўстанавілі, што з ліку шматлікіх найменняў бытавых прадметаў такімі лексемамі кампанентамі абраны толькі асобныя, сярод якіх назвы сталовай пасуды ці сталовых прыбораў (*талерка, лыжка, нож*), рэчаў хатняга ўжытку (*караб, рэшата*), гаспадарчага прызначэння (*бочка, мех, мяшок, торба, шыла*), відаў мэблі (*ложа*). Іх адбор абумоўлены захаванасцю з мінулага сімвальнага значэння, уласцівага кожнай такой лексеме. У прыватнасці, лыжка найперш сімвалізуе малую колькасць (*лыжка дзёгцю <у бочцы мёду>; у лыжцы вады ўтапіць* і інш.), нож служыць сімвальным абазначэннем зброі, смерці, пагрозы (*пад нажом* паміраць (памерці); *<як, што> нож у сэрца; як нажом па сэрцы;* прыставаць *з нажом да горла; усадзіць нод у спіну* і інш.), торба – беднасці, разарэння (*да торбы* давесці, дайсці; *пускаць з торбай па свеце* і інш.) і інш. Як вынік створаныя вобразы ФА з абранымі кампанентамі выступаюць адзінкамі для засваення маральна-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

этычных прынцыпаў, праходзяць культурную інтэрпрэтацыю ў прадметна-рэчавым кодзе культуры, кодзе культуры, знакі якога ўтрымліваюць і даносяць розныя сэнсы, а фразеалагізмы з гэтым кампанентам набываюць функцыі эталонаў, стэрэатыпаў і сімвалаў.

**Літаратура**

1 Лепешаў І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. Т. 1: А – Л / І. Я. Лепешаў. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 672 с.; т. 2: М – Я / І. Я. Лепешаў. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 704 с.

***К. А. Крукоўская***
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ПСІХАЛАГІЧНАЯ ФУНКЦЫЯ ПЕЙЗАЖУ Ў ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА «НА РОСТАНЯХ»

На думку даследчыкаў, адлюстраванне прыроды і пейзажу займае значнае месца ў многіх творах мастацкай літаратуры. Тэарэтыкі літаратуры выдзяляюць некалькі функцый пейзажу ў мастацкіх тэкстах, адна з якіх –псіхалагічная – “звязана з перадачай душэўнага стану персанажаў”, “падрыхтоўвае чытача да змен у іх жыцці”, “стварае псіхалагічны настрой успрымання тэксту” [1, с. 130]. Звернемся да прыкладаў яе рэалізацыі ў трылогіі Я. Коласа “На ростанях”. Заўважна, што ў творы часта сустракаецца вобраз дарогі, які, з’яўляючыся элементам пейзажу, робіць яго дынамічным, маляўнічым і, да ўсяго, адлюстроўвае перажыванні, настрой, пачуцці галоўнага героя: спрыяе паглыбленню яго засяроджанасці, супакойвае, развейвае невясёлыя думкі і турботы, напаўняе радасцю. Знаходзіцца ў дарозе для Лабановіча – натуральны стан. Ён абумоўлены як сюжэтам твора (герой падоўгу не затрымліваецца на адным месцы), так і любоўю маладога настаўніка да падарожжаў (яго вабяць *“неакрэсленыя далечы, маўклівыя і мудрыя ў сваёй задуменнасці”* [2, с. 38]). Настрой галоўнага героя ў творы наўпрост звязаны з настроем акаляючага асяроддзя, больш таго, яны узаемаабумоўленыя, таму цяжка вызначыць, што з’яўляецца першасным – псіхалагічны стан Лабановіча ці вясёлы / змрочны, як правіла, лясны, пейзаж. То чытач бачыць Андрэя ў дарозе радаснага і шчаслівага ад кахання: *“Штось прыемнае і радаснае ўлівалася яму ў душу ад гэтых новых малюнкаў і ад гэтага размашыстага бегу машыны”* [2, с. 19]. То Лабановічу ў дарозе пуста і самотна. Ён пакідае Цельшына і назірае статычныя, нерухомыя малюнкі: *“лес нерухліва развесіўшы свае галіны”, “вятрак з занямелымі ў вячэрняй цішы крыллямі”. “Дарога крута паварочвала”* [2, с. 175], а разам з ёй само жыццё настаўніка.

Такім чынам, пейзаж у трылогіі “На ростанях” выступае сродкам характарыстыкі ўнутранага стану героя. Чалавек і навакольная прырода ў Я. Коласа гарманічна ўзаемазвязаныя.

**Літаратура**

1 Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры: дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Яцухна; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – 279 с.
2 Колас, Я. На ростанях / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 383 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ